ЗГОДА

ГРАМАДСКА – ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

лістапад 1993

№ 14 (20)

КОШТ 15 РУБ.

ЧАСТКА ТЫРАЖУ — ПА СВАБОДНЫХ ЦЭНАХ

Вярхоўны Савет абяцаў прызначыць новыя парламентскія выбары на сакавік 1994 года. Да выбараў засталося...

Время крутых социальных ломок и потрясений — это еще и время парадоксов. Наблюдать их интересно, жить в них трудно. Поспорить есть о чем, а вот купить — то нечего, то не за что. Плюрализм мнений — скудость меню. «Верхи» уже не могут, но еще намертво держат свои бастионы. «Низы» уже не хотят, но вопреки классику, устав от перманентной революции, мудро не торопятся идти на «штурм неба». Люди держат свои бастионы семейные и бытовые, профессиональные и духовные. У станка и у холста, на дачах и огородах, в очередях.

Верховный Совет — детище переломного времени, противоречиво соединив в себе консервативное с реформаторским, поражает всех то неожиданными вспышками радикализма, то упорным сопротивлением всему новому. Он сделал свое дело, но уйти не желает. А от него требуют. Лозунг Даешь досрочные выборы» как дамоклов меч над ним. Но не пугает. Двенадцать сессий позади. Юбилейная — тринадцатая — началась. Между ней и предыдущей пролегло девять месяцев. Почти год каникул, почти год бездействия высшей законодательной власти в условиях жесточайшего кризиса — парадокс не из мировой практики.

Со зримым отпечатком перехода всей полноты власти к исполнительной ее ветви. Тем более, что ее представителям в Верховном Совете принадлежат добрых две трети мест. Противостояния ветвей власти, тут Станислав Станиславович прав, в Беларуси действительно нет. В том числе, добавим, и на уровне руководителей. Соединенные одной цепью своеобразных социально-экономических и политических обстоятельств, свойственных Беларуси, и Кебич, и Шушкевич хорошо понимают, что отставка одного, почти автоматически ведет к отставке другого. И потому оба внимательно стерегут политическое пространство от появления третьей, альтернативной им фигуры.

Девять месяцев на Олимпе власти длились каникулы. И внешне — почти никаких изменений. Все та же политика «верхов», все та же апатия «низов», все та же слабость оппозиционного лагеря. Но подспудно, глубинно изменения произошли. И существенные.

Прежде всего в настроениях населения. Под грузом обвального ухудшения условий жизни, недовольство властью стало едва ли не всеобщим и едва ли не на пределе терпения.

Налицо также поляризация правящего и оппозиционного лагерей, «партии Совмина» и противостоящих ей всех действительных партий. При этом внутренние противоречия между оппозиционными силами сглаживаются, они объединяются на требованиях создания коалиционного правительства, проведения досрочных выборов Верховного Совета по смешанной системе — территориальным округам и партийным спискам. Характерно, что идею выборов от партий, согласно последним социологическим опросам, поддержало около 50 процентов экспертов. И это при слабости многопартийной системы. Как тут власть предержащим не усмотреть еще одну угрозу себе. И еще одну: в голосах недовольства правительством ряда местных Советов, впервые прозвучавших открыто и громко.

Не случайно монолитность их рядов подернулась трещинами сомнений и расколов. В их настроении и действиях уже явственно различимы признаки и растерянности, и смятения, и готовности к резким действиям. Не случайным можно считать и предложение В. Ф. Кебича занять пост заместителя Председателя Совмина Г. Д. Карпенко. Равно, как и его опровержение с последующим подтверждением. И уже вовсе чем-то зловещим повеяло от обращения Совмина «К гражданам Республики Беларусь», от невиданного скопления спецвойск на площади Независимости, в Доме правительства и во дворе за ним. Все эти парадоксы так или иначе проявились, нашли свое продолжение в парадоксах первых дней работы 13-ой сессии Верховного Совета.

Очевидно, преобладающее настроение большинства депутатов и, как ни странно, самого спикера, уйти от обсуждения животрепещущих проблем экономики, вывода республики из кризиса, укрывшись в тихой бухте многомесячного обсуждения статей Конституции, всей повестки дня, натолкнулось на резкое сопротивление многих парламентариев. Причем, не только из числа оппозиции. Ситуацию окончательно переломило заявление группы депутатов, оглашенное Геннадием Карпенко.

Из доклада руководителя государства депутаты и народ наконец услышали о всей тяжести экономической ситуации, о потерянных для реформ годах. Признание в кризисе, политической власти, правда, не последовало, но это уже из разряда всем очевидного. Как очевидна необходимость кардинальной реорганизации структур исполнительной власти, обновления кадров, равно как и необходимость разработки программы действий по выводу страны из кризиса на основе консультаций правительства с представителями партий, профсоюзов, учеными, специалистами. Вне зависимости от того дойдет ли дело до отставки этого правительства, самих В. Ф. Кебича, С. С. Шушкевича.

Алексей КОРОЛЬ



ОТ СЕССИИ ДО СЕССИИ



ВСЕ ХУЖЕ И ХУЖЕ



ДОКЛАД ОБ ОРГАНИЗАЦИОННОЙ РАБОТЕ ИСПОЛКОМА.

Докладчик — председатель исполкома Алшеев А. Н.

Друзья!

Я искренне от исполкома Партии народного согласия приветствую вас, делегатов и гостей II съезда. Тот факт, что мы вопреки всему и вся собрались на съезд свидетельствует о том, что наша партия состоялась, что она является общенациональной силой, что она имеет историческую перспективу. В апреле прошлого года, на I съезде мы начали процесс создания партии, который несмотря на все трудности, сложности и противоречия все более приобретает тенденцию к расширению и углублению.

Условия, в которых работает партия весьма далеки от благоприятных. Во-первых, это острая политическая и экономическая ситуация, сложившаяся в республике. Я не буду подробно на ней останавливаться, т. к. ее анализ сделал Геннадий Дмитриевич. Тем не менее, необходимо указать на то обстоятельство, что правительственный лагерь, не считаясь с реалиями, постоянно нагнетает обстановку в обществе, стимулирует социальную напряженность, проявляет политический дальтонизм в отношении к своему народу, а также к политическим партиям и общественным движениям. Достаточно сказать, что исполком ПНС неоднократно инициировал предложение о проведении широких политических консультаций с участием парламентских, правительственных кругов с одной стороны и представителей политических партий и общественных движений с другой, с целью выработки программы выхода из кризиса.

Во-вторых, деятельность партии проходила в чрезвычайно сложных общественно-политических условиях, характеризующихся дальнейшим падением активности населения, индифферентностью и апатией подавляющего большинства общества. Народ устал от экономического хаоса и от сопутствующей ему политической трескотни на всех уровнях. Наступил период массового неверия ни в настоящее, ни в перспективу будущего. Данное обстоятельство в значительной степени затрудняет организаторскую работу партии.

Лозунгами, призывами, заявлениями сегодня никого не привлечь и не накормить. В связи с этим хочется высказать слова огромной благодарности собравшимся в этом зале людям, осознающим всю ответственность за настоящее и будущее своего Отечества.

В-третьих, остро стоит финансовая проблема. Налицо парадоксальная ситуация: партия, обладая богатым интеллектуальным потенциалом, влачит нищенское материальное существование. Рассчитывать на материальную поддержку членов партии не приходится, т. к. сами они поставлены нынешним правительством перед проблемой биологического выживания.

Руководство республики осознанно или неосознанно продолжает проводить недальновидную политику, направленную на уничтожение интеллектуального генофонда нации. Гамлетовский вопрос — быть или не быть — сегодня все больше превращается в вопрос как быть, т. е. как выжить, как обеспечить свои семьи необходимым. Отсюда затянувшаяся ситуация с выходом партии из эмбрионного состояния, отсюда ряд проблем, которые мы не можем решить. Взять хотя бы помещение под офис партии. Или оплаты командировок в местные организации.

Многим из вас, по-видимому, известна та, мягко выражаясь, нечистоплотная, позиция правительственных структур, доведших дело до суда и, образно выражаясь, выбросивших нас на улицу из арендуемого помещения.

В-четвертых, это то, что вся организационная, теоретическая и практическая работа ведется небольшим составом членов исполкома. И снова вопрос упирается в финансы. Как это ни печально, но мы не смогли создать хоть бы небольшой, из 2-3 человек, аппарат для ведения работы на профессиональной основе.



Сделано мало или много, хорошо или плохо, — судить Вам. Практика показала, что энтузиазм когда-нибудь иссякает и его место занимает депрессия. Действительно, износ наших, образно выражаясь, ударных сил налицо.

Однако, несмотря на отмеченные трудности, можно констатировать некоторые положительные итоги работы. Деятельность партии велась по нескольким направлениям: теоретическая, политико-консультативная и организационная. Позвольте несколько подробнее остановиться на организационной работе.

Ее основными направлениями были следующие:

Во-первых, организация деятельности партии.

Во-вторых, конкретная работа по созданию партийных организаций.

Работа исполкома строилась на основании разработанного плана, в соответствии с которым заседания проводились регулярно — один раз в неделю. Вопросы, выносимые на обсуждение, касались самого широкого спектра проблем внутрипартийной жизни, внутреннего развития государства, внешней политики и т. д. Под непосредственным руководством исполкома был разработан проект избирательного закона и концепция приватизации, в последующем вынесенные на рассмотрение сессий Верховного Совета. Исполком подготовил ряд заявлений и обращений, которые получили широкую общественную поддержку.

За истекший период был проведен ряд двусторонних консультативных встреч с представителями различных партий, общественных движений.

Большая работа осуществлена по созданию блока центристских сил. Намечен конкретный план работы исполкома ПНС и исполкома БНПК. Хочу отметить наиболее активное участие в работе исполкома Лойко Л. В., Стадуба И. Д., Анташкевича И. В., Короля А. С.

Второе направление деятельности исполкома было связано с созданием первичных парторганизаций. За истекший период в 30 районах республики создано около 100 первичных организаций с общим количеством членов порядка 3 тыс. человек. Состояние партийной документации, отражающей количественные характеристики партии, на прошлой неделе проверялось Минюстом республики, который отметил ее безупречное ведение и достоверность представленных материалов.

Кроме первичных организаций ПНС располагает разветвленной сетью групп поддержки и содействия, представляющих почти все районы республики.

Наиболее сильные парторганизации в г.Минске, Витебске, Гродно, Брестской области, Несвиже, Вилейке, Жлобине, Рогачеве, Любанском, Минском и Смолевичском районах.

Хочу отметить активных организаторов и пропагандистов партии на местах. Это: Тетерина Л. С., Короткевич А. А., Анташкевич И. В., Шингель Л. Д., Довгель Е. С., Ермолицкий М. А., Крюковский В. Д., Кирбай А. А., Авсиевич М. Г., Лисовский и др.

Создание первичек явилось результатом личных контактов, встреч с различными категориями населения.

Как результат проделанной работы можно рассматривать рейтинг ПНС среди других политических партий. Социологический опрос, проведенный летом 1993 г. службой «Общественное мнение», свидетельствует о том, что ПНС находится на 3-м месте после БНФ и ПКБ.

Таким образом, за истекший период сделано немало. Мы должны учитывать, что это был период становления, который содержал ряд издержек, недоработок, ошибок. Теперь мы имеем кое-какой опыт. Исходя из него можно обозначить некоторые перспективы будущей работы партии.

1. Необходимо там, где имеются наши первичные организации, усилить работу по пропаганде своих лозунгов, принципов, программных положений. С этой целью исполком должен разработать соответствующие методические рекомендации для проведения такой работы.

2. Чрезвычайно важным моментом остается создание новых первичных организаций. Используя оправдавшую себя форму — это личный контакт с людьми, необходимо вместе с тем более широко использовать телевидение, радио, прессу. Членам исполкома и Совета партии целесообразно постоянно выступать в средствах массовой информации по различным вопросам общественной жизни.

3. Исходя из уже имеющихся наработок нужно буквально в ближайшее время завершить работу над программой социально-экономических преобразований в республике.

4. Необходимо предложить нашу программу в социальной сфере, базирующуюся не на иллюзиях,а на реалиях действительности, предусматривающей решение конкретных острых проблем.

5. Буквально после съезда необходимо разворачивать работу по подготовке к выборам в Верховный Совет и местные органы власти. Эта работа выдвигается на передний план. Она должна вестись целенаправленно и систематически всеми без исключения первичными организациями.

В заключение своего выступления хочу сказать, все, что мы делаем, абсолютно не преследует никакой личной выгоды, мы искренне хотим помочь людям.

ДАКЛАД МАНДАТНАЙ КАМІСІІ II З'ЕЗДУ ПАРТЫІ НАРОДНАЙ ЗГОДЫ

Дакладчык — член выканкома Стадуб І. Дз.

Паважаныя дэлегаты!

Другі з'езд Партыі народнай згоды праходзіць ва ўмовах паглыблення палітычнага і эканамічнага крызісу ў рэспубліцы, скарачэння вытворчасці, усеагульнага дэфіцыту, разгулу злачыннага свету, нежадання або няўмення ўладарных структур праводзіць рэформы.

Узмацняецца палярызацыя палітычных плыняў, актывізуюцца прыхільнікі каманднаадміністрацыйнай сістэмы, якія імкнуцца ў поўным аб'ёме аднавіць былую сістэму, любымі шляхамі ўсядзець у даўно аблюбаваных цёплых крэслах. Свае правалы ў эканоміцы і палітыцы яны імкнуцца перакласці на дэмакратычныя партыі, якія быццам бы давялі дзяржаву да жабрацкай торбы.

У гэтых умовах праходзілі выбары на II з'езд Партыі народнай згоды, у гэтых умовах праходзіць і з'езд партыі.

На пасяджэнні Савета 26 чэрвеня 1993 года быў вызначаны парадак абрання дэлегатаў на з'езд. У адпаведнасці з ім выбары дэлегатаў праводзіліся на сходах членаў ПНЗ у пярвічных і тэрытарыяльных арганізацыях.

Ад арганізацый, якія налічвалі ў сваім складзе ад трох да дзесяці чалавек, з правам рашаючага голасу на з'езд абіраўся адзін дэлегат.У арганізацыях, якія налічвалі больш дзесяці чалавек, з правам рашаючага голасу на з'езд абіраўся адзін дэлегат ад кожных дзесяці членаў партыі.

Члены Савета і Кантрольнай камісіі абіраліся на з'езд з правам рашаючага голасу ў тэрытарыяльных арганізацыях, дзе яны знахозіліся на ўліку, або па рашэнню Савета ПНЗ. Тэрытарыяльныя арганізацыі мелі права абіраць на з'езд дэлегатаў з правам дарадчага голасу. Парадак іх абрання і колькасны склад вызначалі самі арганізацыі.

Члены ПНЗ — адзіночкі атрымалі права ўдзелу ў рабоце з'езду з правам дарадчага голасу.



Мандатная камісія азнаёмілася з анкетамі дэлегатаў і лічыць, што ўсе яны абраны ў адпаведнасці з умовамі, вызначынымі Саветам партыі, і прызнала паўнамоцтвы ўсіх дэлегатаў.

Дэлегаты з'езда прадстаўляюць амаль усе сацыяльныя слаі насельніцтва, розныя галіны вытворчасці. Яны выбраны партыйнымі арганізацыямі, якія маюцца у 30 раёнах, шасці абласных цэнтрах.

Сярод 141 дэлегата маюцца народныя дэпутаты Рэспублікі Беларусь, дэпутаты гарадскіх, раённых і сельскіх Саветаў, кіраўнікі вытворчасці, прадпрымальнікі, інжынерна-тэхнічныя работнікі, прадстаўнікі навуковай і творчай інтэлігенцыі, работнікі народнай асветы, рабочыя.

У ліку 141 дэлегата — 21 жанчына, што складае 14,9 % ад агульнай колькасці дэлегатаў.

На II з'езд выбраны прадстаўнікі розных пакаленняў. Ва ўзросце да 40 гадоў — 37 чалавек (26,4 працэнтаў), ад 41 да 50 гадоў — 70 чалавек (49,6 працэнтаў), ад 51 да 60 гадоў — 27 (19,1 працэнтаў). Больш за 60 гадоў — 7 чалавек (4,9 працэнтаў). Высокі агульнаадукацыйны ўзровень дэлегатаў. 129 чалавек (91,5 працэнтаў) маюць вышэйшую адукацыю. Сярод іх 6 дактароў і 26 кандыдатаў навук (22,7 працэнтаў). 11 чалавек з сярэдняй адукацыяй (7,8 працэнтаў) і 1 з няпоўнай сярэдняй.

Па нацыянальнаму складу дэпутаты размяркоўваюцца наступным чынам:

беларусаў — 102 чалавека (72,4 %)
рускіх — 26 чалавек (18,5 %)
украінцаў — 5 чалавек (3,5 %)
палякаў — 2 чалавекі (1,4 %)
яўрэяў — 1 чалавек (0,7 %)
сербаў — 1 чалавек (0,7 %)
не назвалі сваёй нацыянальнай прыналежнасці — 4 чалавекі (2,8 %)

Упершыню абраны на з'езд 72 чалавекі. Не з'явіліся на з'езд па розных прычынах (хвароба, камандзіроўкі і г. д.) 8 чалавек.

На сённяшні дзень кола прыхільнікаў партыі даволі вялікае. Яны маюцца практычна ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

У апошнія месяцы павялічыўся прыток у партыю інтэлігенцыі, працуючай і студэнцкай моладзі. Хочацца спадзявацца, што беларуская інтэлігенцыя і моладзь значна актывізуюць свой удзел у палітычным жыцці рэспублікі. Надзеі гэтыя не беспадстаўныя. Нядаўна створаны маладзёжны саюз «Згода», прадстаўлены на гэтым з'ездзе некалькімі дэлегатамі.

Вышэй сказанае дазваляе зрабіць вывад аб тым, што кіруючымі органамі партыі за справаздачны перыяд зроблена пэўная работа па пашырэнню радоў партыі і стварэнню пярвічных арганізацый, нягледзячы на вялікія цяжкасці і адсутнасць неабходных сродкаў.

На думку Мандатнай камісіі, саставу дэлегатаў дазваляе пры канструктыўнай рабоце з'езда выпрацаваць такія рашэнні, якія з'явяцца добрай асновай для далейшага развіцця партыі, удакладнення яе праграмы па вываду Рэспублікі Беларусь з цяжкага крызіснага стану, будуць садзейнічаць аб'яднанню ўсіх дэмакратычных сіл.

ДОКЛАД ОБ ИЗМЕНЕНИИ В УСТАВЕ ПНС.

Докладчик — член исполкома П. И. Бригадин.



На Ваше рассмотрение предлагается внести в Устав ряд изменений.

Прежде всего, в соответствии с требованиями Министерства юстиции, необходимо исключить из II раздела «Права и обязанности членов ПНС» статью 3, допускающую коллективное членство в партии.

В целях создания более четкой организационной структуры партии, повышения эффективности работы ее руководящих органов исполком предлагает избрать не председателя партии, а председателя Совета партии, который будет одновременно и председателем исполкома ПНС.

В этой связи предлагается ряд изменений в раздел III «Организационная структура Партии народного согласия». Пункт «г» статьи 19 изложить в следующей редакции: «Съезд избирает тайным или открытым голосованием Совет партии, членов контрольной комиссии». Пункт «и» статьи 22: «Совет партии избирает исполком, председателя Совета партии и заместителей председателя Совета партии». Статью 23: «Председатель Совета партии избирается не более чем на четыре срока подряд». Далее по тексту.

Предлагается также в разделе IV «Правовое и финансовое положение партии» дополнить статьей: «Сумма взносов и сроки уплаты определяются первичными организациями». Соответственно в разделе IV «Правовое и финансовое положение партии» в статье 24. В пункте «а» 24 статьи запись о добровольных взносах заменить на запись «регулярно уплачиваемые членских взносов».

Спасибо за внимание.

ЗВАРОТ ПРАДСТАЎНІКОЎ ПАЛІТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ ДА НАРОДНЫХ ДЭПУТАТАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Паважаныя народныя дэпутаты!

Эканамічная і грамадска-палітычная сітуацыя, якая склалася ў Беларусі, патрабуе неадкладнага прыняцця Вярхоўным Саветам дэмакратычнага выбарчага закона і назначэння новых парламенцкіх выбараў на сакавік 1994 года.

Сусветны вопыт сведчыць, што фарміраванне праваеой дзяржавы, сучаснай палітычнай сістэмы немагчыма без шматпартыйнай дэмакратыі. Спробы адхіліць палітычныя партыі ад удзелу ў грамадска-палітычным жыцці краіны не могуць расцэньвацца інакш, як рух да новага таталітарызму, да дыктатуры.

Таму мы патрабуем, каб у новым выбарчым законе была прадугледжана магчымасць выбараў часткі народных дэпутатаў па партыйных спісках. Няма сумненняў у тым, што палітычныя партыі ўключаюць у свае выбарчыя спіскі найбольш аўтарытэтных, вядомых у Беларусі людзей. Адкрытае абмеркаванне і ўсенароднае галасаванне за партыйных кандыдатаў — гэта на сённяшні дзень лепшыя гарантыі супраць закуліснай, мафіёзнай палітыкі, супраць маніпуляцый на выбарах.

Ад вашага рашэння, паважаныя народныя дэпутаты, ад пазіцыі кожнага з вас залежыць, ці замацуецца ў Беларусі дэмакратыя цяпер, ці гэта застанецца заданнем для наступнага складу парламента.

Зварот падпісалі:

Партыя народнай згоды, Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада, Беларуская сялянская партыя, Аб'яднаная дэмакратычная партыя, Партыя камуністаў Беларусі, Хрысціянска-дэмакратычная злучнасць.

ПНЗ: ХРОНІКА • ПНЗ: ХРОНІКА

Лідэру ПНЗ Генадзю Карпенка прапанавана пасада віцэ-прэм'ера.

Напярэдадні сесіі Вярхоўнага Савета 3 лістапада старшыні ПНЗ Генадзю Карпенка патэлефанаваў прэм'ер Вячаслаў Кебіч і запрапанаваў яму ўвайсці ў склад урада ў якасці намесніка старшыні Савета Міністраў. 5 лістапада адбылася сустрэча В. Кебіча з Г. Карпенка, падчас якой прэм'ер удакладніў, што прапануе лідэру ПНЗ узначаліць эканамічныя рэформы ў Беларусі. Генадзь Карпенка заявіў прэм'еру, што перш, чым даць адказ, ён павінен параіцца з калегамі па партыі, з іншымі грамадскімі дзеячамі Беларусі, правесці кансультацыі з палітычнымі партыямі і рухамі аб умовах уваходжання ва ўрад, прынцыпах правядзення рэформ.

Аднак 9-га лістапада «Радыёфакт» і газета «Звязда» са спасылкай на «дакладныя крыніцы ў Доме ўрада
надзю Карпенка. У той жа дзень па
Старшыня Савета Міністраў В. Ф.
прапанову Г. Д. Карпенка.

8 лістапада выканкам партыі на
аб мэтазгоднасці уваходжання
палітычных сіл у сучасных умовах.

Члены ваканкама прышлі да выс
магчымасці да рэарганізацыі струк
людзьмі кампетэнтнымі, да правя
насці ён можа стаць пры пэўных умовах першым крокам да фарміравання кааліцыйнага ўрада.

Генадзь Карпенка, члены ПНЗ распачалі кансультацыі з палітычнымі партыямі і рухамі, прафсаюзамі, прадстаўнікамі прамысловасці і прадпрымальнікамі.

***

Савет ПНЗ на пасяджэнні 29 кастрычніка вылучыў кандыдатам ў народныя дэпутаты Рэспублікі Беларусь па Жодзінскай — Фабрычнай выбарчай акрузе N 87 Георгія Станіслававіча Таразевіча.

Выступіўшыя ў падтрымку кандыдата члены Савета зыходзілі з таго, што Г. С. Таразевіч даўно з'яўляецца прыхільнікам партыі, займае рэалістычныя пазіцыі па актуальных пытаннях сучаснасці.

Г. С. Таразевіч — вядомы палітычны дзеяч, кандыдат тэхнічных навук. Нарадзіўся ў 1937 годзе ў вёсцы Слабада Мядзельскага раёна, беларус. Скончыў Львоўскі палітэхнічны інстытут. Працаваў інжынерам, старшым, галоўным інжынерам экспедыцыі, дацэнтам інстытута. Займаў шэраг адказных пасад у савецкіх і партыйных органах. З'яўляўся Старшынёй Вярхоўнага Савета БССР, дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР, Старшынёй Камітэта геадэзіі пры Савеце Міністраў Рэспублікі. Цяпер працуе першым намеснікам міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь.

Другім пытаннем Савет разглядаў ініцыятыву выканкома аб сумесным звароце ўсіх палітычных партый Беларусі да дэпутатаў Вярхоўнага Савета прызначыць дату датэрміновых выбараў не пазней сакавіка 1994 года па тэрытарыяльных акругах і партыйных спісах.

ПРОФСОЮЗЫ

28 октября состоялся пленум Федерации профсоюзов Беларуси. Обсуждены действия профсоюзов в сложившейся в республике социально-экономической ситуации и Концепция развития профсоюзного движения. Подтверждена приверженность курсу на создание в республике социально ориентированной рыночной экономики со смешанными формами собственности. Поддержано требование президиума Совета ФПБ рассмотреть на предстоящей сессии Верховного Совета вопрос о социально-экономическом положении, осуществлении мер по сдерживанию инфляции, пересмотру налоговой системы в сторону стимулирования производителей, обеспечению реальной экономической интеграции с другими странами.

Профсоюзы и впредь будут настаивать на государственном регулировании цен на хлеб, молоко, электроэнергию. Разрыв между ростом потребительских цен и доходами населения, заработной платой не может превышать 25 — 30 %. Всем профсоюзным структурам предложено принять участие в разработке программ занятости населения на 1994 г., не допустить формального применения Закона «Об экономической несостоятельности и банкротстве». Пленум настаивает на принятии национальной Программы по удовлетворению потребностей граждан в жилье. Его участники высказались в поддержку требований работников агропромышленного комплекса и непроизводственной сферы.

Подтверждена позиция профсоюзов о необходимости досрочных выборов Верховного Совета.

Подведены итоги опроса членов профсоюзов о необходимости проведения досрочных выборов в Верховный Совет. Акцию профсоюзов поддержали 738 тысяч членов профсоюзов. В опросе приняли участие более 8 тысяч первичных организаций. Активно поддержали требование о досрочных выборах члены профсоюзов авиационных работников, работников автосельхозмаша, водного транспорта, геологов, образования и науки, радиоэлектронной и оборонной промышленности, строительства и промстройматериалов, профсоюза, обслуживающего вооруженные силы. Президиуму Совета ФПБ поручено информировать об итогах опроса предстоящую сессию Верховного Совета.

На пленуме выступил и ответил на многочисленные вопросы председатель Верховного Совета Республики Беларусь С. С. Шушкевич. Заслушано также выступление заместителя председателя Совета Министров В. А. Заламая.

Неожиданный комментарий пленума ФПБ В. Ф. Кебичем. Из выступления Председателя Совета Министров на расширенном совместном заседании Совета Конфедерации промышленников и Президиума Белорусской научно-промышленной ассоциации: *«Сегодня ваши профсоюзы завтра станут вашими врагами. Это было сегодня видно на пленуме профсоюзных организаций, когда идет стыковка оппозиционных сил и профсоюзов во имя того, чтобы опять прийти к власти.»*

РЕД. Отношение В. Ф. Кебича к профсоюзам и оппозиционным силам понятно. Непонятно только, когда это они были у власти, чтобы опять к ней прийти.

КТО ЖЕ ПОДСТРЕКАТЕЛИ?

Катастрофически теряя доверие сограждан, но не желая утратить власть, правительство в своем обращении «К гражданам Республики Беларусь» от 5 ноября 1993 года, пытается переложить вину за кризис на плечи оппозиционных сил, средств массовой информации, обвиняя их в распространении слухов, листовок, призывов, угроз, провоцирующих, якобы, население на массовые гражданские беспорядки, незаконные действия, и, страшно подумать, вооруженные выступления. Обращение пестрит ярлыками из мрачной памяти прошлого тоталитарного режима: «провокаторы», «политические авантюристы», «подстрекатели». Фактов, аргументов, подтверждающих обвинения в обращении не приводится.

Очевидно, что этот акт Совмина не во благо гражданскому согласию, способен резко обострить политическую ситуацию в республике.

Мы вправе спросить: «Кто стоит за подписью обращения: «Совет Министров Республики Беларусь»? Голосовалось ли оно на коллегии? Подписывали ли его министры и председатели госкомитетов? И готовы ли они подтвердить свое согласие с текстом обращения? Готовы ли это сделать, например, министр внутренних дел Егоров, министр образования Гайсенок, заместитель председателя Совмина Демчук? То есть, люди, чей образ в глазах общественности достаточно демократичен? Или все за всех определила воля и росчерк пера одного лица?

Алексей КОРОЛЬ, член исполкома ПНС.

ТАКОЕ ШМАТПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

ПАСЯДЖЭННЕ АНТЫКРЫЗІСНАГА КАМІТЭТА.

В. Ф. КЕБІЧ АДПРАЎЛЕНЫ Ў АДСТАЎКУ. ЯГО ПАСАДА ЗАСТАЕЦЦА ПАКУЛЬ ШТО ВАКАНТНАЙ.

На пасяджэнні Антыкрызіснага камітэта Рэспублікі Беларусь 5 лістапада абмеркаваны пытанні аб Старшыні Антыкрызіснага камітэта, магчымых фактарах пагрозы суверэнітэту краіны і неабходных захадаў па яго ўмацаванню.

Прадстаўнікі палітычных партый і грамадскіх арганізацый, якія ўваходзяць у камітэт, прыйшлі да высновы, што абраны на гэтую пасаду спадар В. Ф. Кебіч не выканаў ускладзеных на яго задач і амаль аднагалосна, пры адным устрымаўшымся, прагаласавалі аб вызваленні яго ад займаемай пасады.

Даручана Выканаўчай Радзе правесці перагаворы з вядомымі палітычнымі і грамадскімі дзеячамі адносна будучага кіраўніка камітэта.

Антыкрызісны камітэт прыняў заяву «Аб неабходнасці самастойнай эканамічнай палітыкі Рэспублікі Беларусь». У ёй адзначаецца, што ўсе рэфармісцкія дзеянні цяперашняга ўрада былі «вымушанай рэакцыяй на развіццё падзей у суседніх краінах». Падтрымліваецца ідэя шырокага эканамічнага супрацоўніцтва з Расіяй і іншымі краінамі СНД. Разам з тым рашуча адвяргаецца неабходнасць ратыфікацыі Пагаднення аб аб'яднанні грашовай сістэмы Рэспублікі Беларусь з грашовай сістэмай Расійскай Федэрацыі.

У заяве выказваецца неабходнасць стварэння новага ўрада, здольнага «праводзіць самастойную эканамічную палітыку на карысць Беларусі». Першачарговымі задачамі яго павінны быць урэгуляванне з Расіяй і іншымі краінамі СНД валютных, гандлёвых і мытных дачыненняў і — галоўнае — рэальнае рэфармаванне эканомікі.

У Заяве «Аб патрыятычным выхаванні грамадства» падкрэсліваецца, што пабудова незалежнай, дэмакратычнай, моцнай у эканамічных, палітычных і духоўных адносінах дзяржавы немагчыма без такіх вызначальных фактараў, як дзяржаўны патрыятызм, гонар за прыналежнасць да беларускай дзяржавы і яе слаўную гісторыю.

Школа палітыкі

Улада: паняцце і сутнасць.

1. Улада: паняцце і сутнасць.

Прырода ўлады ў сучаснай палітычнай навуцы інтэрпрэтуецца вельмі разнастайна. Адзін з крайніх пунктаў гледжання на ўладу наогул адмаўляе магчымасць пазнання яе прыроды. Дастаткова распаўсюджана ўяўленне аб уладзе як атрыбутыўнай уласцівасці любых біялагічных сістэм. Некаторыя мяркуюць, што ўлада абазначае рэальную здольнасць аднаго з элементаў існуючай сістэмы рэалізаваць асабістыя інтарэсы ў яе рамках, і ў гэтым сэнсе ўлада ёсць ажыццяўленне ўплыву на працэсы, накіраванага ўплыву. Другія уяўляюць, што ўлада прадстаўляе сабой такія ўзаемаадносіны паміж людзьмі,альбо групамі людзей, сутнасць якіх заключаецца ва ўплыве, уздзеянні, што гэтае імкненне да дасягнення раўнавагі. Існуюць інструменталістскія, структуралістскія, тэалагічныя, канфліктапагічныя і іншыя падыходы да азначэння ўлады.

З усіх гэтых падыходаў вынікае, **што ўлада ў агульным плане — гэта сукупнасць умоў, заснаваных на сіле, традыцыях, згодзе, неабходных для захавання вызначаных правіл і ўстанаўлення пэўнага парадку ў чалавечых адносінах. Улада — гэта здольнасць і магчымасць аказваць вызначаны ўплыў на дзейнасць, паводзіны людзей з дапамогай якіх-небудзь сродкаў: волі, аўтарытэту, права ці гвалту.**

У кожным грамадстве ёсць розныя інтарэсы, якія сутыкаюцца паміж сабой. Для рэгулявання, супадпарадкавання гэтых інтарэсаў і патрэбна ўлада. Інакш кажучы, яна выступае формай сацыяльных адносін, якая характарызуецца магчымасцю тых ці іншых сацыяльных сіл здзейсніць сваю волю ў адносінах да іншых сацыяльных сіл альбо асоб з дапамогай дзяржаўна-прававых сродкаў. **Такім чынам, палітычная ўлада — гэта форма арганізацыі публічнай улады ў грамадстве, мэтай якой з'яўляецца рэгуляванне, або аказанне ўплыву на ход сацыяльных працэсаў праз дзяржаўны механізм ці іншыя грамадска-палітычныя структуры.**

Са сказанага зусім не вынікае, што палітычная ўлада зводзіцца да дзяржаўнай улады. Гэта прынцыповае пытанне. Яно актуальна не толькі ў тэарытычным, але і ў чыста практычным плане. Вопыт недалёкага мінулага ярка сведчыць, што атаясамліванне гэтых паняццяў з'яўляецца метадалагічнай асновай адзяржаўлення ўсіх структур палітычнай сістэмы. Дзяржаўная ўлада з'яўляецца ядром палітычнай улады. Не выпадкова ўлада набыла палітычны характар у працэсе складання дзяржавы. Аднак **паняцце палітычнай улады значна шырэй улады дзяржаўнай. Дзяржаўная улада — гэта такая форма грамадскай улады, якая апіраецца на спецыяльны апарат прымусу і мае манапольнае права выдаваць законы і іншыя распараджэнні, абавязковыя для насельніцтва.** Дзяржаўная ўлада заўсёды ёсць улада палітычная, але не ўсякая палітычная ўлада ёсць улада дзяржаўная. Палітычная дзейнасць можа ажыццяўляцца не толькі ў рамках дзяржавы, але і з дапамогай іншых інстытутаў палітычнай сістэмы — партый, грамадска-палітычных арганізацый і рухаў. Прыроду дзяржаўнай улады характарызуе, перш за ўсё, яе здольнасць дасягаць тых ці іншых мэтаў з дапамогай прымусу. Разам з тым, дзяржаўная ўлада не абавязкова ўжывае прымус для дасягнення сваіх мэтаў. Яна можа дасягаць іх і іншымі сродкамі — ідэалагічным уздзеяннем, эканамічным стымуляваннем і г. д. Але яна валодае манаполіяй на тое, каб прымусіць членаў грамадства да выканання сваіх пастаноў.

Такім чынам, з усяго сказанага напрашваецца выснова, што ў цывілізаваным грамадстве публічная ўлада заўсёды непарыўна звязана з палітыкай. У паліталагічнай літаратуры нярэдка распачынаюцца дыскусіі аб прыярытэце ці першаснасці адной з гэтых з'яў. Гэтае пытанне няпроста вырашыць. Улада безумоўна з'яўляецца сродкам ажыццяўлення палітыкі. Барацьба за ўладу — адзін з асноўных аспектаў палітычнага жыцця грамадства. Але, атрымаўшы уладу, тыя ці іншыя палітычныя сілы здзейсняюць сваю асабістую палітыку, якая становіцца сродкам улады. Выходзіць, палітыка аказваецца прычынай улады, а ўлада прычынай палітыкі. Гэта значыць, што палітыка і ўлада злучаны кругавой прычынна-выніковай залежнасцю.

Улада як сацыяльная з'ява мае шэраг прыкмет. Да іх ліку адносіцца тое, што ўлада ўяўляе пэўныя адносіны залежнасці паміж людзьмі ў грамадстве; мае характар валявога ўзаемадзеяння; здзяйсняецца з дапамогай асаблівых, уладных метадаў. Разгледзім гэтыя прыкметы больш падрабязна.

Паняцце «залежнасць» у адносінах да працэсаў, якія адбываюцца ў грамадстве, уключае ў свой змест факт узаемадзеяння, узаемаўплыву людзей або іх адносін адзін да адна-го. Залежнасць уяўляе азначаны від сувязі, накіраваны ў адзін бок працэс уздзеяння. Такая сітуацыя падкрэслівае няроўнае становішча ў якіх-небудзь адносінах паміж элементамі сістэмы. Уладная залежнасць можа быць непасрэднай ці апасрэдаванай праз шэраг адносін прамежкавых элементаў, якія знаходзяцца паміж крайнімі членамі дадзенага віда адносін. Яна можа быць простай і складанай. Простай, калі размова ідзе аб непасрэднай сувязі двух элементаў; складанай, калі асобныя элементы або групы элементаў гэтай сістэмы знаходзяцца ў адносінах узаемадзеяння з цэлым шэрагам элементаў. Кожны з указаных відаў уладнай залежнасці праяўляецца ў адпаведных абставінах спецыфічна ўласцівым яму спосабам.

Валявы характар улады вынікае з самой прыроды дадзенай з'явы як асобай формы ўздзеяння, якое ажыццяўляецца з дапамогай розных метадаў з мэтай арыентацыі дзейнасці людзей ў неабходным для ўлады напрамку. Гэтае ўздзеянне носіць апасрэдаваны характар праз патрэбнасці і інтарэсы. Узаемадзеянне, барацьба ў сувязі са сцвярджэннем інтарэсаў здзейсняецца праз валявыя адносіны. Пры гэтым неабходна адрозніваць разнаякасныя ўзроўні праяўлення волі. Калі на ўзроўні псіхалогіі воля выступае як якасная характарыстыка канкрэтнага чалавека, то на сацыяльна-псіхалагічным узроўні маецца на ўвазе выяўленне той ці іншай супольнасці сваіх інтарэсаў на практыцы.

Улада выкарыстоўвае розныя метады валявога ўздзеяння, якія могуць мець фізічны, маральна-псіхалагічны, ідэалагічны характар і ажыццяўляцца з дапамогай эканамічных ці палітычных сродкаў. Асноўнымі уладнымі метадамі з'яўляюцца гвалт, прымус, пераконванне і захаванне. Як правіла, усе гэтыя метады выкарыстоўваюцца ў розных суадносінах адначасова. Аднак пераважнае значэнне можа быць ададдзена і якому-небудзь аднаму з іх. Напрыклад, пры таталітарным рэжыме вядучая роля належыць гвалту, пры дэмакратычным — пераконванню.

Адам МЕЛЬНІКАЎ,
кандыдат філасофскіх навук, дацэнт.

БЕЛАРУСЬ В ВАЛЮТНОЙ ПОЛИТИКЕ МОСКВЫ

«Трибюн», 29 октября: Россия явно стремиться оградить российский рубль от пагубных последствий слишком быстрых темпов создания валютного союза. Конкретно речь идет об определении десятка таких экономических показателей, как инфляция, бюджетный дефицит, степень регламентации цен, обменные курсы и т. д.

Экономические соображения берут вверх над интересами русских, проживающих в этих странах и не имеющих российских рублей, и над тем, что государства-кандидаты на вступление в валютный союз переживают более острый кризис, чем Россия и в целом находятся в самом начале процесса экономических реформ.

Государства, желающие войти в новую рублевую зону, должны ввести свою национальную, или переходную денежную единицу. Во время этого переходного периода будет установлен фиксированный обменный курс национальных валют и российского рубля. Процесс создания валютного союза будет включать несколько этапов, и пионером в этом деле могла бы стать БЕЛАРУСЬ, которая уже ввела в обращение купоны.

ЭКОНОМИЧЕСКАЯ БЛИЗОРУКОСТЬ ПРАВИТЕЛЬСТВА

Положение, которое сложилось в экономике республики, нельзя назвать иначе, как катастрофическим. Некоторые политические деятели специально скрывают истинное состояние экономики. Драматизм ситуации характеризуется прежде всего продолжающимся спадом производства, снижением национального дохода, ростом безработицы и низким уровнем жизни населения республики. Если в прошлом году национальный доход, как основной показатель богатства и бедности, уменьшился на 11 процентов, то в этом году он достиг 15 процентов, недополучено товаров промышленного производства на 17 процентов, а сельского хозяйства — на 20 процентов. Не усложняя ситуацию, можно прямо сказать, что экономика республики находится на грани полного обвала.

В чем причина критической ситуации в экономике, кто в этом виноват? Эти вопросы на устах у всех жителей республики. Ответ однозначен: Верховный Совет и Правительство Республики Беларусь в социально-экономической деятельности потерпели полное фиаско, явившись тормозом технического прогресса и роста благосостояния собственного народа.

Экономическая ситуация требовала от правительства колоссальной работы по глубокой структурной перестройке народного хозяйства. Задачей номер один для правительства должно быть преобразование ресурсоемких производств и интенсивное развитие наукоемких отраслей, обеспечивающих ускоренный рост экспортного потенциала. Неспособность правительства управлять экономикой практически спровоцировала недопоставки в республику энергоносителей из стран ближнего и дальнего зарубежья. Под вывеской защиты собственного рынка правительство ввело повсеместные таможни, различные пошлины, запретило вывоз многих товаров, поставило препоны движению товаров и капиталов.

Структурная перестройка подразумевает и создание конкурентной среды, необходимой для эффективного использования рыночных механизмов. И здесь задержка из-за неспособности к новаторской работе нашего правительства. Высшая государственная администрация республики сама сохранила структуру, методы работы и кадровый состав обанкротившейся номенклатурной иерархии. Как показал экспертный анализ, проведенный Партией народного согласия, в Совете Министров Республики созданы громоздкие бюрократические структуры с неисчисленным количеством министерств, госкомитетов, комитетов, отделов, управлений, многократно дублирующие друг друга. *В правительстве есть все условия не для эффективного управления экономикой, а для безответности и бездействия чиновников, коррупции, сращивания госаппарата с коммерческими структурами и теневым капиталом.* Поэтому дальнейшее проведение экономической реформы требует в первую очередь реформирования структурной перестройки самого Совета Министров Республики.

Не лучшим образом складываются и дела в сельском хозяйстве. Еще в 1990 году в республике было произведено в расчете на душу населения 727 кг молока, 115 кг мяса, 800 кг зерна. Это еще был достаточно высокий уровень развития аграрного сектора. Однако, только за два года, буквально по всем видам сельскохозяйственной продукции производство снизилось на 25-40 процентов. *Расстроена кредитно-финансовая система колхозов и совхозов. Значительно постарели производственные фонды, снижается плодородие почвы. Прекратились вложения хозяйств в развитие инфраструктуры села.* Несмотря на многочисленные заявления и обещания правительства, не получили развития и фермерские хозяйства.

За последние три года правительство нанесло по сельскому хозяйству несколько ударов. Главный из них — это «ножницы цен», которые подстригли экономику колхозов и совхозов до такой степени, что большинство из них находится на грани банкротства.

Ситуация в сельском хозяйстве республики требует осуществления экстренных мер, которые можно сконцентрировать по следующим направлениям:

— реформирование (акционирование) колхозов, совхозов, перерабатывающих предприятий, создание многоукладного хозяйства;

— реконструкция и расширение сферы доработки и переработки сельскохозяйственной продукции за счет государственных и частных инвестиций;

— сокращение и реформирование государственных органов управления агропромышленным комплексом.

Развитой рыночной экономике свойственна и соответствующая кредитно-денежная и финансовая системы. *Свою некомпетентность в этой сфере правительство пытается скрыть, перекладывая вину за инфляцию на соседнее государство.*

Попытки создания национальной валюты, вступление, выход и опять вступление в рублевую зону, выпуск собственных «зайчиков», все это напоминает детские игры в самостоятельность. Экономика не терпит некомпетентного обращения с финансовой системой и кредитно-денежными отношениями. Вступление в единую рублевую зону усугубит наше экономическое состояние, поскольку инфляция российского рубля обесценит труд белорусского производителя.

Особо следует остановится на фискальной политике государства, сущность которой раскрывается налогами и бюджетом. Налог, как экономическая категория, является денежной платой субъектов хозяйствования за услуги, которые оказывает им государство. У правительства превратное понимание налогов. *Оно, практически, забирает всю прибыль за неоказываемые услуги.* Государству, в принципе, нужна не высокая норма налога, а растущие объекты налоговых поступлений, обусловленные ростом производства и хозяйственной активности в целом. *Система налогообложения республики направлена не на стимулирование деловой активности и ликвидацию товарного дефицита, а на латание дыр государственного бюджета.*

Реформирование налоговой системы должно идти по следующим направлениям.

— Ограничение суммы всех налогов, которыми облагаются предприятия, 35 — 40 % прибыли, снижение налога на добавленную стоимость до 15 — 20 %.

— Устранение практики многократного обложения одной и той же производственно-хозяйственной деятельности.

— Дифференциация налогообложения экономической деятельности в зависимости от ее характера и направленности.

Главное, чтобы все виды деятельности, приносящие доход, должны быть налогооблагаемыми, а уровень налогов стимулировал предпринимательство и эффективность производства.

Можно до бесконечности приводить факты экономической некомпетентности правительства. *Это провал политики разгосударствления и приватизации собственности, декларирование социальной защиты населения, реализация чернобыльской программы, обострение экологической обстановки в республике, резкое снижение деторождаемости и увеличение смертности* и многое другое. Фактов достаточно, чтобы сделать вывод: правительство получило полное фиаско в своей экономической и социальной деятельности. Поэтому оно *не подлежит реформированию, а полным составом должно уйти в отставку, чтобы дать возможность новым силам компетентно решать проблемы становления качественно нового уклада жизни общества.*

Николай ДРОЗД,
кандидат экономических наук,
член исполкома ПНС.

Заснавальнікі:
Партыя народнай згоды, калектыў рэдакцыі.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не абавязкова супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.

Адрас рэдакцыі:
Антонаўская, 8-а
тэл. 36-84-30

Намеснік галоўнага рэдактара
Аляксей Кароль

Друкарня «Перамога», 222310, Маладзечна, вул. Таўлая, 11. Індэкс 63138, тыраж 7000 экз. Зак. 1071. Ліцэнзія ЛВ N 135